**Из воспоминаний Нины Гавриленко:**

*...Наша вуліца звалася Ранда. Помніцца, дзеці ўсе збіраліся там разам, і было нам вельмі добра. Бо на такім раздоллі можна гуляць у розныя гульні, пабегчы на луг, да рэчкі. Альбо зазірнуць у прыгажуню-дуброву. Аніколі там сумна не было, у любую пару года радасцю напаўнялася душа. І калі бачыш, як вясна завязвае зялёныя хусцінкі стрункім дзяўчынкам-бярозкам. І ўлетку: бо прама за нашым агародам — квяцісты луг, крыху далей — рачулка, далей на ўзгорку — дуброва. Ля рэчкі збіраліся і дарослыя, і дзеці. Колькі было весялосці, гоману, пацехі! Потым і восень зачароўвала багаццем садоў і агародаў. Помніцца, нібы прасіўся мне ў рукі росны крамяны яблык.... У барвова-залацістых уборах красаваліся дрэвы, кусты. А ў грыбную пару я хадзіла ў дуброву з маленькім сабачкам, падобным да мядзведзіка. Як смешна шукаў ён лісічкі, выграбаючы іх лапкамі. А там — цішыня, толькі лісточкі шапочуць. Як у чароўнай казцы.*

*Бацькі вучылі мяне паважаць людзей працы. Упершыню пачула: радзіма пачынаецца з зерня, кінутага ў раллю. І я з асаблівай павагай ставілася да сельскіх працаўнікоў. Неяк мне давялося назіраць, як зладжана працуюць жанчыны на ўборцы сена. Яны — такія прыгожыя ўсе, загарэлыя, у лёгкіх квяцістыхсукенках. Працавалі ўвішна, з усіх бакоў чуліся жарты і смех. Здавалася, прырода нават радавалася за людзей. І што ярчэй свяціла сонца, паглядаючы на прыгажосць працы, чалавечых зносін, прыгажосць вясковага наваколля і натуральную жаноцкую прыгажосць. Як даўно тое было…*

*Мая мама працавала настаўніцай у Брацькавіцкай сярэдняй школе. З маленства я палюбіла школу, бо маці часта расказвала пра свае школьныя справы, настаўнікаў, вучняў. І прытым дабрынёю свяціліся вочы яе. Бо і яна любіла гэтых адкрытых людзей, якія ўмелі старанна працаваць, прыгожа адпачываць. Вечарамі ўлетку збіраліся разам на вуліцы. І мне прыемна было слухаць, як спяваюць жанчыны, любавацца, як срэбрам блішчаць росы ў лузе. Адчуваць усім целам, як ціха засынае зямля. Паілі пахкім водарам паветра начныя фіялкі. А побач — мама. Дарэчы, яна, Аўхачова Марыя Іванаўна, была ў Брацькавічах і кіраўніцай мастацкай самадзейнасці. Цягнуліся да прыгажосці, да сцэны настаўнікі, вучні ды іншыя вяскоўцы. Тыя хвіліны пераўтварэння на сцэне, помніцца, прыносілі задавальненне і гледачам, і вясковым артыстам, сярод якіх было нямала сапраўдных талентаў. А які заліхвацкі быў малады прыгожы баяніст! І ганаровая грамата Міністэрства культуры БССР прыехала ў вёску — заслужана!*

*У Брацькавічах, аддаючы належнае працы, шанавалі й святы. Хораша іх адзначалі. Скажам, мы з сяброўкамі з нецярпеннем чакалі Вялікдзень: да*

*гэтага свята мая мама звычайна шыла нам новыя сукенкі. Спявала, помніцца, ад радасці душа. І хацелася некуды бегчы, ляцець, імчацца — як той веснавы ручаёк, жвавы, светлы, чысцюткі……*

*Але ж як абароніш усё тое, калі на родны парог, у родную вёску прыйшла нябачная бяда — радыяцыя? Мы цягнуліся да святла, дабрыні. Як цягнецца маленькі расток насустрач ласкаваму сонцу і ветрыку — не ведаючы, што наперадзе яго чакаюць і холад, і сцюжа. Што яго і проста так, без дай прычыны, можа знішчыць чалавек. Як вялікая рака бярэ свой пачатак з маленькіх вытокаў, так і настаўнікі падпітвалі нас ведамі, рыхтавалі да самастойнага жыцця. Добра, пэўна, што тады мы не ведалі: у жыцці ёсць няўдачы, нягоды, пакуты… І таму школьныя гады застануцца ў памяці як штосьці самае светлае і чыстае.....*

*Цягнецца душа мая і сэрца да родных мясцін. І як жа шкада, што ніколі не сустрэне ўжо мяне ля веснічак бацькоўскае хаты мама. Не сагрэе сваёй любоўю… Некалькі разоў я мела магчымасць на Радаўніцу наведаць вёску ў зоне адсялення. Гатова была цалаваць родную зямлю, гатова кланяцца ёй: як у шчаслівы, так і ў трывожны час. А вяскоўцы нашыя на могілках абдымаліся, гаварылі, ды нагаварыцца не маглі. Нейкае своеасаблівае цяпло сыходзіла ад роднае зямлі. І не хацела яна быццам бы адпускаць ад сябе родных дзяцей сваіх …*

*Цяпер не магу ўжо я наведваць родныя мясціны. І вёскі няма, і роднае хаты, якая, падаецца мне, можа прылашчыць так, як маці дзіця. Не пазнаць ужо й месца, дзе былі нашы Брацькавічы. Але мая маленькая радзіма нават такая, асірацелая, усё роўна родная і блізкая. Як добра, што ў жыцці маім была вёска Брацькавічы! З яе беластволымі бярозкамі… Чаромхаю… Квітнеючым лугам… Бацькоўскаю хатай… Школаю… І якую ж уладу мае прырода, навакольны свет над чалавекам! З прыродных крыніц бяруць натхненне мастакі, ствараючы свае карціны. А пісьменнікі выяўляюць пачуцці ў апавяданнях, вершах. І нараджаюцца песні. Слухаеш іх ды ўяўляеш, як шумяць бярозы на беразе ракі. Бачыш неба, поўнае зор, чуеш дзівосныя шэпты лясоў… Здаецца: усё гэта там, у бацькоўскім кутку. Дзе назаўсёды засталіся частка душы і сэрца ўсіх нас, вяскоўцаў.*